# Міністр Сяргей Папкоў выступіў на Чацвёртым форуме рэгіёнаў Расіі і Беларусі

Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Папкоў прыняў удзел у рабоце Чацвёртага форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі. На пасяджэнні секцыі "Супрацоўніцтва расійскіх і беларускіх IT-кампаній на рынках Расіі і Беларусі, а таксама трэціх краін» таксама выступаў Міністр сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі Мікалай Нікіфараў. Тэмай для абмеркавання стала супрацоўніцтва ў сферы электроннага ўрада, абмен вопытам па развіццю IT-адукацыі, супрацоўніцтва ў сферы электроннага гандлю, развіццё дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы ІКТ, распрацоўка праграмных прадуктаў для дзяржаўнага сектара і абарона крытычнай дзяржаўнай IT-інфраструктуры.

«Толькі аб'яднаўшы намаганні і магчымасці, мы можам паспяхова адстойваць нашы інтарэсы ў сусветнай эканоміцы, на глабальным рынку, а Форум рэгіёнаў - выдатная дзейсная пляцоўка для перамоў па шырокаму спектру пытанняў рэгіянальнага партнёрства», - заявіў Сяргей Папкоў.

Сяргей Папкоў выступіў з прывітальным словам перад удзельнікамі пасяджэння і расказаў, што для нашай краіны развіццё сектара інфармацыйных тэхналогій з'яўляецца прыярытэтным. Укараненне перадавых тэхнічных рашэнняў ужо заклала надзейную аснову для фарміравання інфармацыйнага грамадства ў Беларусі, а таксама забяспечыла ўмовы, якія фарміруюць спрыяльнае асяроддзе для жыцця грамадзян і паспяховага вядзення бізнесу.

«Асаблівая ўвага актыўнаму развіццю інфармацыйных тэхналогій у нашай краіне надаецца Кіраўніком дзяржавы. У штогадовым пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка адзначыў, што наступным этапам развіцця будзе будаўніцтва IT-краіны. Наша задача - стварыць такія ўмовы, каб сусветныя лідэры ў гэтай сферы адкрывалі ў Беларусі свае прадстаўніцтвы, цэнтры распрацовак і стваралі запатрабаваны ў свеце прадукт з высокім дабаўленым коштам », - падкрэсліў Міністр сувязі і інфарматызацыі Беларусі.

Сяргей Пятровіч Папкоў адзначыў, што сёння супрацоўніцтва рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі ў сферы інфармацыйных тэхналогій становіцца адной з фундаментальных асноў стратэгічнага партнёрства і саюзніцтва паміж дзвюма краінамі. У сувязі з гэтым невыпадкова мэтай Чацвёртага форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі з'яўляецца пашырэнне беларуска-расійскага рэгіянальнага супрацоўніцтва і садзейнічанне ўсталяванню прамых кантактаў паміж рэгіёнамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі ў сферы інфармацыйных тэхналогій.

«Спадзяюся, што Форум стане платформай для аб'яднання намаганняў і рэсурсаў для пашырэння далейшага ўзаемавыгаднага партнёрства, стварэння трывалых сувязяў у сферы інфармацыйных тэхналогій і вызначэння доўгатэрміновых перспектыў, якія адкрываюцца перад нашымі краінамі ў гэтай сферы», - заявіў Сяргей Папкоў.

Удзельнікі пасяджэння далажылі аб бягучым стане электроннага ўрада, яго праблемных пытаннях і перспектывах. На пасяджэнні таксама была прадстаўлена інфармацыя аб падтрымцы інавацыйных IT-кампаній на рынках Расіі і Беларусі, а таксама трэціх краін, абмяркоўваліся асноўныя перашкоды на шляху сумесных распрацовак беларускіх і расійскіх IT-прадпрыемстваў.

Па выніках мерапрыемства Сяргей Папкоў і Мікалай Нікіфараў падпісалі рэкамендацыі

«Супрацоўніцтва расійскіх і беларускіх IT-кампаній на рынках Расіі і Беларусі, а таксама трэціх краін». У прыватнасці, бакі дамовіліся:

- падтрымліваць правядзенне сумесных мерапрыемстваў для арганізацыі абмену вопытам, развіцця электронага ўрада абедзвюх краін;
- актываваць супрацоўніцтва навуковых устаноў, арганізацыю навуковага і эканамічнага абмену студэнтаў і выкладчыкаў;
- узмацніць узаемадзеянне ў галіне забеспячэння міжнароднай інфармацыйнай бяспекі, стварэння сістэмы маніторынгу і сумеснага рэагавання на ўзнікаючыя ў гэтай сферы пагрозы;
- забяспечыць удзел прадстаўнікоў дзяржавы ў выставах, семінарах, канферэнцыях, форумах, прысвечаных пытанням развіцця інфармацыйных тэхналогій.

На пасяджэнні прысутнічалі прадстаўнікі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савета Федэрацыі і апарата Савета Федэрацыі Федэральнага сходу РФ, кіраўнікі рэгіянальных органаў дзяржаўнай улады, прадстаўнікі навуковых арганізацый, IT-кампаній дзвюх краін.

---

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/30-06-2017-2105*